1993 г


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР 21 СТУДЗЕНЯ 1993 года № 1 (1688)


## ПРЫЙШЛА СЕСІЯ — АДЧЫНЯЙ ВЕСНІЧКІ!

НА ПАМЫЛКАХ ВУЧАЦЦА

### ЯК, ДЗЕ, КАЛІ МЫ ЗДАБЫВАЛІ ВЕДЫ?

***У кожнага студэнта ёсць свае сакрэты спасціжэння навук. І свае маленькія прыкметы - прадчуванні. Кажуць, напрыклад, што не трэба ні ў якім разе паказваць каму-небудзь сваю залікоўку перад іспытам, акрамя, зразумела, выкладчыка, якому збіраешся прадэманстраваць свае веды. Некаторыя ў ноч перад іспытам заўсёды кладуцца спаць галавою на поўдзень. Іншыя зберагаюць усе 5 гадоў шчаслівае адзенне. Прапануем вашай увазе некалькі суб'ектыўных меркаванняў, невялікае прэс-апытанне студэнтаў-хімікаў.***

**Сяргей САМАЛАЗАЎ, V курс:**

— Што для студэнта галоўнае? Зрабіць так, каб не вучыцца наогул. І навучыліся ўжо шмат чаго для гэтага рабіць. І не толькі добрыя шпаргалкі...

**Андрэй БЛАХІН, IV курс:**

— Не магу вучыцца з самага ранку, лепш за ўсё — пасля абеду і да позняй ночы — прыкладна да дзвюх гадзін ночы. Вучуся дома, у бібліятэцы цяжка сканцэнтравацца.

**Алёна, яго жонка:**

— У бібліятэцы можна заснуць. І дома можна заснуць... Таму вучуся і ў бібліятэцы, і дома.

**Сяргей ЗОТАЎ, V курс:**

— У бібліятэку люблю хадзіць задоўга да іспыту, а за некалькі дзён — ужо позна. Вучуся дома. Але лічу, што іспыт — не самае галоўнае для студэнта. Галоўнае — асабістае жыццё.

### ШТО, БРАЦЕ, СЯДЗІМ?





**Накіроўвалася ў чытальную залу універсітэцкай бібліятэкі, каб пабачыць наплыў студэнтаў і ўпэўніцца, што на паліцах не засталося ўжо ніводнага падручніка. А сустрэла мяне цішыня. Жана Сцяпанаўна КАРПОВІЧ, вядучы бібліятэкар, растлумачыла:**

— Звычайна нашу чытальную залу наведвае 86 чалавек за дзень, але апошнімі днямі — амаль напалову менш: 40—50 чалавек. Прычынай таму, можа стацца, і той факт, што студэнты філалагічнага і філасофска-эканамічнага факультэтаў у былой партшколе па вуліцы Карла Маркса маюць свае добраўладкаваныя чытальныя залы.

Калі гэта так, то падстаў для хваляванняў няма. Тым больш, што асноўны ўдар баталіі пад час сесіі бярэ на сябе Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Па дадзеных **Ларысы Іванаўны ПРАДКА**, загадчыцы аддзела абслугоўвання былой «Ленінкі», у дзень бібліятэку наведвае каля 2 тысяч чалавек. Усяго за 1990 год 37 тысяч чалавек карысталася паслугамі галоўнай бібліятэкі рэспублікі. Сярод іх — 17 тысяч студэнтаў. Самы загружаны месяц за мінулы год — красавік: больш за 50 тысяч наведванняў зарэгістравана на працягу яго (амаль палову складаюць студэнты), а ў ліпені (відомая справа — студэнты ж адпачываюць!) — толькі каля 16 тысяч.

Супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі да напружанай працы не прывыкаць. Пад час запраграміраванага вучэбнымі праграмамі ВНУ цэйтноту тут уводзяцца дадатковыя рэзервы — павялічваецца колькасць кафедраў выдачы літаратуры і пасадачных месцаў. Імпануе, пэўна, наведвальнікам яшчэ адно новаўвядзенне — сталы з перагародкамі. Але калі нават не ўлічваць камфорт і ўтульнасць, студэнты ведаюць, што ў гуллівых пакоях былой «Ленінкі» можна знайсці ўсё. Няма часу шукаць патрэбныя падручнікі? Затое заўсёды пад рукой патрэбныя студэнты з выратавальным канспектам.

ПЕРАПЫНАК

### СПОНСАР ЗНОЙДЗЕНЫ! КУДЫ ЖАДАЕЦЕ?

Калі вы, дзякуючы агульным намаганням вашых здольнасцей і зорак, што вызначаюць лёс кожнага з нас, развітваецеся з усімі залікамі і іспытамі тэрмінова — не грэх падумаць і аб адпачынку пад час канікул. ДЛЯ АМАТАРАЎ ПАДАРОЖЖАЎ. Рыхтуйцеся да замежных паездак. Ёсць магчымасць наведаць Санкт-Пецярбург. А лепш — праехацца па Залатому Кальцу: Уладзімір — Суздаль — Багалюбава. Калі яшчэ дзявдзецца ўсё гэта пабачыць? Раю пасля апошняга іспыта ўзважыцца. Тым, хто схуднеў і змарнаваўся на харчу духоўным, адпачынак — тое, што доктар прапісаў. І далёка не трэба ехаць. У прафкоме студэнтаў ёсць пуцёўкі ў дом адпачынку ў Пухавічах, на турбазу Раўбічы, у тургасцініцу альбо дом адпачынку на возеры Нарач. А можна і на мора. У нас ёсць сваё, Мінскае. На яго беразе — Маладзёжны цэнтр «Юнацтва».

Поўны кошт пуцёвак — прыкладна ад чатырох да дзевяці з паловай тысяч рублёў. Але для студэнтаў гэтыя лічбы, дзякуючы прафкому, адпаведна паменшацца ў 10 разоў! Чаго яшчэ жадаць?

### ПА ТЭЛЕФОНЕ

На працягу ўжо некалькіх гадоў Нацыянальная бібліятэка Беларусі аказвае платныя паслугі. Гэта многія ведаюць. Але можна ж і разгубіцца пад час сесіі, калі трэба берагчы кожную хвіліну. Самыя патрэбныя паслугі для студэнтаў і самыя танныя — ад трох да сямі рублёў. Ёсць шмат паслуг з аплатай па дамоўленасці, але пакуль можна абысціся і без іх.

Каб не марнаваць час у даведачна-бібліяграфічным аддзеле, можна заказаць бібліяграфічны спіс па поўнай тэме. За шэсць рублёў у выпадку вострай неабходнасці можна забяспечыць сябе і начным «чціва», узяўшы падручнік дадому на суткі.

А яшчэ можна заказаць літаратуру па тэлефоне для браніравання ў чытальных залах. Трэба толькі ведаць дакладныя бібліяграфічныя звесткі аб патрэбных кнігах. Званіце — 27-89-14.

ЁСЦЬ ІДЭЯ!

### БЛІЖЭЙ ДА ЦЭНТРА

Ў Цэнтры маладзёжных ініцыятыў — заціша. Па словах Аляксея Багдановіча, старшыні Цэнтра, зараз тут спее дзве глабальныя ідэі — наконт святкавання 8 Сакавіка, а таксама аб фестывалі ў Вязынцы. Спадзяюцца ў Цэнтры, што на гэты раз адбудзецца самы грандыёзны студэнцкі фестываль.

У кожнага студэнта (і не толькі) ёсць шанц стаць вядомым як вялікі камбінатар, прыйшоўшы ў Цэнтр з якой-небудзь вялікай ідэяй. Да вясны яшчэ далёка, але, калі вы клапоціцеся аб славе свайго факультэта, ужо зараз пачынайце ўводзіць закон навізны, які абвяшчае: жадаеце, каб каманда выйграла скачкі ўгору,— адшукайце аднаго чалавека, які здолее скокнуць на сем футаў, а не сямёра чалавек, што скачуць толькі на адзін фут.

ДОШКА АБ'ЯЎ

### «НЁРУШ» ШУКАЕ МУЖЧЫН

**Народны фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш» аб'яўляе дадатковы набор у мужчынскую групу калектыву. Прадстаўнікі мужчынскай паловы універсітэта, якія неабыякавыя да творчасці «Неруша» і жадаюць мець да яе непасрэднае дачыненне, запрашаюцца па аўторках і чацвяргах на рэпетыцыі ансамбля. Прыходзьце ў актавую залу галоўнага корпуса БДУ а 18 гадзіне.**

ЗДАЧЫ НЕ ТРЭБА

### РАЗМОВА ЗНОЎ ІДЗЕ ПРА ГРОШЫ

**За ўсё трэба плаціць. Пры аднаўленні на наступны курс за кожны іспыт і залік, напрыклад,— па 500 рублёў на ўсіх формах навучання.**

**Ці шмат было такіх разлікаў? У бухгалтэрыі мы даведаліся, што за снежань мінулага года і за палову студзеня гэтага студэнтамі універсітэта пераздадзена дзесьці каля паўсотні залікаў і іспытаў. Дарэчы, доля іспытаў і залікаў у гэтай лічбе прыкладна ў раўнавазе.**

**Атрымалася каля 50 000 рублёў. Шчаслівыя студэнты працягваюць сваё навучанне. А выкладчыкам — дадатковая пагадзінная аплата за незапланаваныя сустрэчы.**

Матэрыялы інфармацыйнай старонкі падрыхтавала **Т. КАЗАК.**

### Будзе ўсім

Пастанова Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва абвергла чуткі пра тое, што стыпендыю будуць атрымліваць толькі выдатнікі і тыя, хто вучыцца на «добра» і «выдатна». Змяніліся толькі яе памеры.

Але ў студзені ўсе атрымалі пароўну — 2400 рублёў (калі не ўлічваць падораныя да Новага года 1000 рублёў).

У бухгалтэрыі прадказалі, што выдатнікаў і «харашыстаў» чакае даплата. Такім чынам, паспяваючыя студэнты будуць атрымліваць стыпендыю ў памеры 2400 рублёў у месяц, студэнты, ш.ія маюць толькі добрыя, а таксама толькі добрыя і выдатныя адзнакі — 2760 рублёў, а толькі выдатныя адзнакі — 3120 рублёў у месяц.

За асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці студэнтам можа быць устаноўлена персанальная стыпендыя Вучонага Савета ВНУ у памеры 3150 рублёў у месяц.

Памер стыпендыі аспірантам вышэйшых навучальных установ і навукова-даследчых установ, калі яны паступілі на вучобу непасрэдна пасля заканчэння ВНУ, а таксама з практычнай работы са стажам да аднаго года пасля заканчэння навучальнай установы, і замежным аспірантам устанаўліваецца ў памеры 6000 рублёў у месяц.

### АБЯЦАЛІ ІМ КРЭДЫТ

**Яшчэ ў кастрычніку парламент Латвіі прыняў рашэнне аб штомесячным крэдытаванні студэнтаў з новага года. Права на суму, роўную 1,5 стыпендыям, атрымалі сіроты, студэнты з сем'яў, у якіх шмат дзяцей, тыя, у каго памёр адзін з бацькоў, дзеці пенсіянераў, а таксама студэнты, якія маюць ужо сваіх дзяцей.**

**Аднак з наступленнем новага года высветлілася, што з павелічэннем бюджэту давядзецца пакуль пачакаць. Урад да гэтага часу не прыняў рашэння для рэгулявання парадку выдачы крэдытаў. Пакуль што большасць малазабяспечаных студэнтаў старэйшых курсаў — а правам валодаюць толькі яны — больш спадзяюцца на ўласныя сілы.**

ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

### ЛІШНІЯ КНІГІ

Аддзел абменнага фонду бібліятэкі БДУ паступова асвойвае, акрамя асноўнага прызначэння, шэраг новых, напрыклад — продаж лішняй літаратуры. І лішняй не таму, што з-за разрыву сувязей паміж былымі рэспублікамі Саюза складана стала і з абменам літаратурай паміж бібліятэкамі, а яшчэ і таму, што шмат кніг (сярод іх і перададзеныя універсітэту бібліятэкай былой партшколы) на наш час проста нікому не патрэбны. Карысталіся попытам раней, мажліва, праз паўстагоддзя спатрэбяцца пунктуальным даследчыкам.

Але пакуль макулатура дня сённяшняга распрадаецца. І вельмі танна. Падлічыце самі: распрадана прыкладна 6 тысяч кніг на суму каля 13 тысяч рублёў.

Заараз на паліцах экспромтнай кніжнай крамы, па словах Ларысы Уладзіміраўны ДУБОК, загадчыцы аддзела абменнага фонду, каля 4 тысяч кніг. Калі ўлічыць, што цікавасць да кнігі расце прама прапарцыянальна даўнасці яе выдання, то можна спадзявацца на другое жыццё кожнай кнігі.

# ПА ЎСІМ СВЕЦЕ НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ

## ПАКУЛЬ ЖЫВУЦЬ НА СВЕЦЕ ДЗІВАКІ





**Больш года падарожнічаюць на веласіпедах па краінах СНД швейцарцы Хайдзі ШЛЕПФЕР і Хуга ТОМІ. Паспелі пабываць у Прыбалтыцы, Санкт-Пецярбургу, Маскве, наведалі Каўказ, Крым і Сярэднюю Азію. І што зусім дзіўна — ні ў Батумі ні ў Краснадары, ні ў Баку, ні ў Ерэване, ні ў Тбілісі, ні ў Ашгабадзе — не здарылася з імі нічога жахлівага.**

**Гэтую зімоўку, як і мінулую, Хуга і Хайдзі праводзяць у Мінску, пакуль іх веласіпеды адпачываюць аж у Прэжэвальску. Сёння падарожнікі — нашы госці.**

**— Як жа вы адважыліся наведаць СНД?**

ХУГА: Як я раней Паўночную Афрыку, Турцыю, Іран, Пакістан, Непал, а Хайдзі — Новую Зеландыю і Заходнюю Еўропу.

ХАЙДЗІ: Мы збіраліся тры гады. Працавалі і збіралі грошы. Нарэшце, звольніліся, пакінулі кватэру, сабралі рэчы і паехалі.

**— Вы абралі пэўную мэту ці проста вырашылі пакатацца?**

ХУГА: Калі сустрэчы з новымі людзьмі і спасціжэнне іх светаўспрымання — мэта, дык, зразумела, не проста пакатацца. Магчыма, потым на аснове дзённікавых запісаў і фотаздымкаў выдадзім кнігу пра падарожжа, людзей і краявіды.

**— Гэта адбудзецца праз колькі гадоў?**

ХАЙДЗІ: Пакуль невядома. Дакладна ўпэўнены, што яшчэ год правядзём у падарожжы да Камчаткі.

**— А ці хопіць у вас грошай і надалей аплочваць выдаткі з уласнай кішэні?**

ХУГА: Калі мы прыехалі сюды, мы нават не ведалі нічога пра цэны. Нават сумняваліся, што ёсць прадукты ў магазінах: разлічвалі дабываць іх у фермераў. Мы не валодалі мовай. Але ж мы не хацелі ўяўляць вашу краіну толькі па чутках. Праўда, разлічвалі правясці тут не больш за год.

**— Вы амаль ужо жыхары нашай рэспублікі. Як ацэньваеце эканамічнае становішча?**

ХАЙДЗІ: У Беларусі лепш, чым, скажам, у Сярэдняй Азіі. Нават чым у Расіі — там цэны больш высокія.

ХУГА: Нельга сказаць, каб на Беларусі людзі жылі вельмі добра. У нас ёсць сябры, якім грошай хапае толькі на ежу. А астатняе?

ХАЙДЗІ: У Швейцарыі, напрыклад, ёсць усё. Вельмі дарагое, але ўсё, што пажадаеш. Калі ж тут складаеш меню, дык трэба спачатку паглядзець, што знойдзеш на паліцах магазіна.

ХУГА: Для нас у студзені мінулага года быў вельмі цяжкі перыяд. Мы не мелі ні талонаў, ні купонаў, ні беларускіх дакументаў.

**— Ці здараліся з вамі смешныя выпадкі?**

ХАЙДЗІ: Самае смешнае — пытанні людзей. Мы ўсім вымушаны казаць, што мы — муж і жонка. Усё зусім не так, але наша шчырасць вашых людзей шакіруе. У Туркменістане адзін мужчына запытаўся, напрыклад, колькі Хуга заплаціў за мяне, і паскардзіўся, што аддаў за сваю жонку 100 тысяч рублёў, вярблюда, незлічоную колькасць баранаў, дываноў...

**— Безумоўна, вы сумуеце па дому?**

ХАЙДЗІ: Часам хочацца хутчэй вярнуцца. Але як успомніш, што трэба будзе шукаць месца работы пры сённяшнім беспрацоўі, дык здаецца, лепш падарожнічаць да больш радасных часін.

**— Што ж, спадарожнага вам ветру!**

**P. S. Здымкі да матэрыяла зроблены В. ФЯДОСЕНКАМ, які летам прымаў удзел у падарожжы Хуга і Хайдзі ад Мінска да Смаленска.**

ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ

# УСЁ ПАЧЫНАЕЦЦА З ДЗЯЦІНСТВА

**Жыццё маленькіх грамадзян — самая дакладная адзнака таго, на што прыдатныя іх бацькі. Як могуць ацаніць сябе дарослыя ў нашым грамадстве, калі столькі няшчасных дзяцей вакол? Ледзь не самыя жорсткія злачынцы — падлеткі. Рост дзіцячай злачыннасці не спыняецца. І крыміногеннае становішча, як сцвярджаюць сацыёлагі, сёння хвалюе людзей не менш, чым эканамічныя цяжкасці.**

Дзе вучацца дзеці быць бязлітаснымі да чужога здароўя і жыцця, калі амаль дзве трэці непаўналетніх злачынцаў — з сем'яў, якія лічацца добрымі? Школа звычайна абвінавачвае ў дрэнным выхаванні бацькоў, тыя, у сваю чаргу, наракаюць на настаўнікаў. А ўзаемаразумення ім не хапае, асабліва цяпер, калі ліквідаваны ўсенавуч, які па сутнасці быў універсітэтам для бацькоў. Цяпер уся работа ў сем'ях перакладзена на плечы класных кіраўнікоў. Але не ўсе яны добра ведаюць заканадаўства і могуць, нават не ўяўляюць, як трэба займацца прафілактыкай правапарушэнняў. У вучэбных праграмах педагагічных ВНУ такія тэмы практычна адсутнічаюць, хаця цяжка назваць важнейшыя з іх. Педагогі застаюцца без прававых ведаў — таксама, як юрысты без педагагічных. У выніку ўсе, хто працуе з падлеткамі, вымушаны дзейнічаць усляпую і дапускаць часам трагічныя памылкі.

Незразумела, чаму ўсялякія спробы змяніць гэтае становішча, застаюцца часцей за ўсё беспаспяховымі. Напрыклад, на кафедры педагогікі нашага універсітэта быў падрыхтаваны зборнік матэрыялаў па праблеме «Падлетак і грамадства». Але ні ў самім Белдзяржуніверсітэце, ні ў Міністэрстве адукацыі не знайшлося сродкаў, каб выдаць яго. Тая ж кафедра зрабіла спробу арганізаваць на адным з факультэтаў студэнцкую практыку работы з цяжкімі школьнікамі. Але для такога карыснага эксперыменту проста не хапіла вучэбных гадзін. Зноў замест праблемы, якая так дорага каштуе грамадству, знайшлося нешта «больш актуальнае». А што ж далей?

# СЯМЕЙНЫ ЭСКУЛАП

Незвычайная кафедра адкрылася ў Маскоўскай медыцынскай акадэміі — сямейнага ўрача. Але сёння гэту прафесію ведаюць ужо ў 38 краінах свету. Прычым там урачы такога профілю звычайна валодаюць больш высокай кваліфікацыяй, чым астатнія.

Арганізатар новай кафедры прафесар І. Дзянісаў лічыць, што сямейныя ўрачы павінны быць асабліва ўважлівымі да сваіх пацыентаў і абавязаны аказваць дапамогу ў любы, нават непрацоўны час, а таксама наведваць сваіх падапечных без іх выкліку.

Для таго, каб атрымаць сертыфікат і ліцэнзію на практыку ўрачавання, неабходна будзе вучыцца 5—6 гадоў плюс тры гады па спецыяльнасці. Тэрмін перакваліфікацыі звычайных медыкаў у сямейных урачоў будзе залежыць ад узроўню іх падрыхтоўкі.

СЛУЖБА 03

# СЦЕРАЖЫСЯ ЖЫВЁЛІН!



***Яго жыццё скончылася раптоўна. Прычынай быў вірус шаленства — смяротная хвароба, пра якую мы так мала ведаем.***

***У верасні мінулага года васемнаццацігадовы навучэнец Смілавіцкага ветэрынарнага тэхнікума падабраў у лесе лісяня і даў яму прытулак. Аднойчы лісяня ўкусіла яго за ступню. За ўрачэбнай дапамогай хлопец звярнуўся толькі ў канцы лістапада, калі адчуў недамаганне. Але выратаваць яго ўжо было немагчыма, 1 снежня ён памёр. Дыягназ — шаленства.***

Гэта даволі рэдкае захворванне. Сёння медыцына не ведае сродкаў яго лячэння. Шаленства заўсёды смяротнае. Яго можна толькі папярэдзіць. Існуюць антырабічныя (рабіес — шалёны ў перакладзе з лацінскай мовы) вакцына і гама-глабулін, якія ўводзяцца па назначэнню ўрача тым, каго ўкусіла жывёліна. Носьбітамі віруса шаленства ў прыродзе з'яўляюцца ўсе цеплакроўныя жывёлы. Часцей за ўсё — сабакі, куніцы, кошкі, ваўкі, шакалы, барсукі, яноты, янотавідныя сабакі і хатнія жывёлы. Асобую небяспеку ўяўляюць бадзяжныя сабакі і кошкі, а з дзікіх жывёл — лісіцы і ваўкі, якія ў перыяд хваробы губляюць страх перад чалавекам і заходзяць у населеныя пункты.

Прыкметы шаленства ў жывёл вельмі разнастайныя. Найбольш характэрныя — слінацячэнне, вадабоязь, агрэсіўнасць. У сабак і кошак часцей бывае буяная форма шаленства: жывёлы становяцца пужлівымі, хаваюцца па вуглах, дрэнна ядуць, збягаюць з дому.

Заразіцца шаленствам можна не толькі ад хворай па знешняму выгляду жывёліны, але і ад здаровай па выгляду, бо вірусы шаленства могуць быць у сліне такой жывёліны за дзясяць дзён да клінічных праяў хваробы.

Узбуджальнік захворвання выдзяляецца разам са слінай і пасля ўкусу пранікае ў рану. Ён рухаецца па нервовых шляхах і дасягае клетак галаўнога і спіннога мозгу. Таму небяспечным бывае не толькі ўкус, але і сліна жывёліны, калі яна трапляе на скуру з пашкоджаннямі, нават не заўважнымі для вачэй.

Пасля скрытага перыяду, які працягваецца ад трох тыдняў да года (у залежнасці ад месца і ступенні пашкоджання), наступае кароткі перыяд прадвеснікаў. Павышаецца тэмпература, з'яўляецца агульнае недамаганне, галаўныя болі, неспакой, парушаецца сон. Нават праз працяглы час пасля загойвання раны хворы пачынае адчуваць боль у месцах пашкоджання. Такі стан працягваецца некалькі дзён, а потым наступае перыяд узбуджэння з самымі цяжкімі праявамі хваробы — вадабоязю і бояззю паветра, якія пераходзяць у стадыю паралічаў са смяротным вынікам.

Як засцерагчыся?

Укусы, драпіны, нанесеныя нават знешне здаровай жывёлай трэба прамыць пад струменем вады, лепей з мылам. Пацярпеўшы павінен адразу ж звярнуцца ў медыцынскую ўстанову, дзе вырашыцца пытанне аб назначэнні і правядзенні спецыфічных прывівак, якія папярэдзяць захворванне.

Відавочна, што поспех іх залежыць ад своечасовасці. Лепей за ўсё пачынаць прывіўкі ў дзень укуса. Самавольныя перапынкі ў правядзенні вакцынацыі ці скарачэнне іх колькасці недапушчальныя. Імунітэт, створаны антырабічнымі прывіўкамі не захоўваецца на ўсё жыццё. Таму калі раней чалавеку былі зроблены прывіўкі супраць шаленства, а яго зноў пакусала жывёліна, вакцынацыю патрэбна паўтарыць. Калі ж прыкметы захворвання на шаленства паявіліся ў жывёлы, яго патрэбна ізаляваць як мага хутчэй і паведаміць ў лячэбніцу.

**Л. АДАРЧАНКА,**
**урач-эпідэміёлаг санэпідстанцыі Ленінскага раёна г. Мінска.**

САМІ З ВУСАМІ

# НЕ АД ДОБРАГА ЖЫЦЦЯ

*Напярэдадні Новага года ў Рэспубліцы пачала дзейнічаць яшчэ адна маладзёжная арганізацыя — асацыяцыя прафсаюзных арганізацый студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі. Карэспандэнт «7 дней» Галіна Малахоўская гутарыць са старшынёй праўлення, выкладчыкам кафедры паліталогіі нашага універсітэта* ***Адамам КІШКЕВІЧАМ.***

**— Асацыяцыя аб'ядноўвае больш за 60 тысяч юнакоў і дзяўчат. І гэта пры тым, што пакуль да нас далучыліся прафсаюзы толькі 23 ВНУ і 24 тэхнікумаў. Калі параўноўваць з іншымі маладзёжнымі рухамі, наша арганізацыя самая магутная.**

— Адам Данілавіч, пэўна, не ад добрага жыцця аб'ядноўваюцца студэнты і навучэнцы?

**— Патрабаванні моладзі не заўсёды чутныя ўраду. Хто змагаецца за іх правы? Галасы ў абарону іх інтарэсаў гучаць разрознена і стыхійна. Добра, што стыпендыя ўжо «прывязана» да мінімальнай заработнай платы. Але тут узнікаюць новыя праблемы. Усё часцей я чую пра тое, каб у наступным навучальным годзе ўвесці на 50 працэнтаў платнае навучанне. Наша пазіцыя цвёрдая: вучоба павінна быць па-ранейшаму даступнай для кожнага здольнага маладога чалавека. Сёння студэнтам і без таго цяжка матэрыяльна. Раней 40-рублёвай стыпендыі хапала на харчаванне, а зараз з 1600—2000 трэба пастаянна шукаць фінансавую падтрымку ў бацькоў.**

— Яшчэ балючае пытанне для моладзі — жыллё.

**— Студэнты Белдзяржуніверсітэта, напрыклад, нават сямейныя, забяспечаны інтэрнатамі. Гэта звязана з тым, што наборы ў ВНУ паступова зніжаюцца. Асабліва скарачаецца колькасць студэнтаў на ФПМІ, радыёфізічным, фізічным факультэтах, хаця, праўда, больш становіцца жадаючых атрымаць кваліфікацыю філолагаў і юрыстаў. Калі раней у БДУ навучалася 10000 чалавек, то зараз — 9500, год-два пасля гэта лічба знізіцца, думаю, да 8000.**

**Час увесці дыферынцыраваную плату для студэнтаў за пражыванне ў інтэрнатах. Пакуль з усіх вылічваецца аднолькава: 10 працэнтаў ад мінімальнай стыпендыі, а бытавыя ўмовы розныя. У іншых ВНУ сітуацыя вывучаецца.**

—Адам Данілавіч, ваш прагноз на 1993 год.

**— Узровень жыцця людзей, а моладзі, якая вучыцца, асабліва, будзе яшчэ больш нізкім. Асацыяцыя таму ўжо зараз спрабуе стварыць камерцыйныя структуры, якія б падтрымлівалі студэнтаў матэрыяльна. На ўрадавым узроўні прадбачу праблемы з адшукваннем сродкаў на фінансаванне навучальных устаноў.**

**У рэспубліцы з'явіцца яшчэ некалькі універсітэтаў. І вось чаму: на Захадзе не шукаюць кантактаў з інстытутамі, іх кадрамі. Мець статус універсітэта прэстыжна.**

НАШ ГОСЦЬ «ПАРЫ-МАТЧ»

# АЛЕН ПРОСТ: «НА ТРАСЕ ШМАТ ПОДЛЫХ ЛЮДЗЕЙ»

**Ён шчаслівы. У 37 гадоў, пасля гадавога перапынку, Ален ПРОСТ зноў за штурвалам гоначнага аўтамабіля. Абвінавачванні Айртона Сены не сапсавалі яму настрой. Дуэль двух трохразовых чэмпіёнаў свету ў «Формуле-1» працягваецца. Французскі пілот — госць часопіса «Пары Матч».**



**— Ален, ваша вяртанне ў «Формулу-1» нагадвае паводзіны акцёраў і спевакоў, якія пасля рашэння пакінуць сцэну ўсё роўна вяртаюцца.**

— Гэта непараўнальна. Мая страсць да «Формулы-1» непахісная. Існуюць абставіны, якія прымусілі мяне спыніцца. Тым не менш, зараз я ведаю, што вярнуўся. У мяне такі настрой, быццам я ніколі не пакідаў спорт.

**— Сёння вы — улюбёнец лёсу. «Уільямс-Рэно» кідае вам пад ногі дыван з ружаў з умовай, што вы пачнеце барацьбу за званне чэмпіёна свету 1993 года...**

— З 1992 года кожны месяц, калі не кожны тыдзень, мы з Франкам Уільямсам тэлефануем адзін аднаму. Вось ужо 10 гадоў дзверы мае заўсёды адчынены для яго. Я не адчуваю сябе чужым. У мінулым годзе ў час майго разрыву з «Ферары» ён адразу ж запрасіў мяне да сябе ў каманду.

Але ў мяне няма патрэбы ў шэфстве. Я б ніколі не згадзіўся прыйсці ў каманду без яе згоды працаваць разам са мной. Пасля развітання з «Ферары» мне хочацца спакойнага акружэння.

Гавораць, каб трапіць да Уільямса, я інтрыгаваў... Але «Формула-1» не прызнае нічога, акрамя майстэрства пілота і яго тэхнічнай кампетэнцыі. У гэтай гісторыі я не ўкраў чыёсьці месца.

**— Дарэчы, за вамі замацавалася рэпутацыя няўжыўчывага чалавека. Вы пакінулі «Рэно», «Макларэн», «Ферары»...**

— Гэта не так. З «Рэно» мае адносіны заглухлі і застапарыліся, але ненадоўга. З «Макларэнам» — не. З «Хондай», якая пазней прызнала фаварытам Сену,— так. «Ферары»? Праз тыдзень пасля майго ад'езду адбыліся перамены. І ў мяне ўжо цікавіліся, ці не хачу я вярнуцца на сваё месца. Я злуюся, калі тэхнік дрэнна выконвае сваю работу. Але я спартсмен і хачу выйграваць. Ніколі не падтрымліваю дарэмныя спрэчкі. Я ўмешваюся толькі тады, калі размова ідзе пра тэхнічныя пытанні.

**— Сёння грошы становяцца гаспадаром «Формулы-1». Бяспека адступае на другі план.**

— Галоўным чынам, калі размова ідзе пра чэмпіянат свету. Аб гэтым нельга маўчаць. На трасе адчуваеш, што «Формула-1» — самае галоўнае ў свеце. Нічога навокал не існуе. Год адпачынку даў мне магчымасць зірнуць на ўсё па-новаму.

**— Вы ніколі не спрабавалі з дапамогай журналістаў справакаваць саперніка?**

— Ніколі. Гэта вельмі небяспечна. Потым усё выйдзе з-пад кантролю. Я заўсёды стараўся быць сумленным і кожны раз атрымліваў удар малатком па галаве. Сёння я ведаю, што на трасе шмат подлых

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*

УВАХОД НЕ ЗАБАРОНЕНЫ

# ГОРКАЕ ЖЫЦЦЁ САЛОДКІХ ЖАНЧЫН

Каму салодка жыць на гэтым свеце? Большасць дзяцей адкажуць аднолькава: «Тым, хто вырабляе цукеркі». Паспрабуйце ўладкавацца на работу на кандытарскую фабрыку «Камунарка», і атрымаеце адмову — вакантных месцаў тут сёння няма. Няўжо так многа жадаючых салодка пажыць? Не спяшайцеся з адказам...

Калі вы дасюль не здзейснілі сваю дзіцячую мару ўбачыць, як тысячы, мільёны цукерак і шакаладак рухаюцца па канвееры, няхай яна так і застаецца для вас прыгожай марай. Прыслухайцеся, калі ласка, да гэтай парады чалавека, які ўжо развітаўся з ёю.

Мне давялося бачыць розныя прамысловыя прадпрыемствы. Нідзе не было так горка, як на салодкай «Камунарцы». Старое абсталяванне і карпусы (фабрыка нарадзілася ў 1932 годзе), брудная тэрыторыя — будаўніцтва ідзе, і самае цяжкае ўражанне — жанчыны. Гэта ім, як думаюць дзеці, салодка жывецца. Чаму ж тады ў іх такі хваравіты выгляд? Амаль ва ўсіх... Відавочна, што салодкая прадукцыя для іх — зусім не прыкмета салодкага жыцця. Яны любілі цукеркі толькі ў пачатку сваёй работы на фабрыцы. Потым, атрымаўшы парушэнне абмену рэчываў і іншыя хваробы, яны перасталі бачыць прывабнае нават у самых смачных вырабах са сваіх канвеераў.

Гэтых жанчын можна зразумець, уявіўшы сябе на іх месцы. Восем гадзін у дзень, з адным перапынкам на абед, яны стаяць на нагах. Медыкі падкажуць вам, колькі хвароб абяцае такая праца жанчынам. Дадайце да іх яшчэ і тыя, што выклікаюцца няспынным шумам у цэхах і пастаянным слінавыдзяленнем ад выгляду ядомай прадукцыі. Язва страўніка — не самы горшы вынік з магчымых.

Нельга сцвярджаць, што жанчыны кандытарскай вытворчасці абавязкова асуджаны на цяжкія хваробы. Ад многіх шкодных уздзеянняў яны маглі б выратаваць сябе самі — напрыклад, схаваць вушы ад шуму пад спецыяльнай хусцінкай, надзець рэспіратар, працуючы з цукровай пудрай, якая літаральна раз'ядае лёгкія... Але яны чамусьці не робяць гэтага. Некаторыя не ведаюць пра сапраўдныя памеры шкоды, іншыя — проста не хочуць. Парадокс? Не, звычайная праява нашага жыцця. Такая думка напаткала мяне ў гардэробе, дзе пераапранаюцца работніцы фабрыкі. Амаль на кожнае паліто надзеты старэнькі хатні халат яго гаспадыні. І так балюча глядзець на гэтыя халаты... Яны ўжо адслужылі сваю доўгую службу на цесных кухнях, а потым ім раптам знайшлі яшчэ адно прызначэнне. Халаты, надзетыя на паліто,— гэта як увасабленне цярплівага характару і цяжкай долі нашых жанчын, якія не ведаюць, што дома можна апранацца прыгожа, а на працоўным месцы адчуваць сябе камфортна. Іх цярплівасць часам больш нагадвае ціхую пакорлівасць лёсу.

А ці ўяўляеце вы сабе, як мы залежым ад гэтых жанчын? Нягледзячы на значную аўтаматызацыю, амаль кожная шакаладка і цукерка з канвеера «Камунаркі» праходзіць праз рукі яе работніц. Як патрэбна нам чысціня гэтых рук! І абавязкова — дабрыня. Гавораць жа, што чалавечы настрой перадаецца вырабам рук яго ўладальніка. А ці можа быць добрым настрой, калі здароўе ніякае? Вось вам і замкнёнае кола...

Ідучы на «Камунарку», мне вельмі хацелася пераканацца, што якасць айчыннага шакаладу не горшая, а нават лепшая, чым таго, замежнага, у прыгожай вопратцы. Не магу сказаць, што гэта мне ўдалося, але да зваротнага вываду я таксама не прыйшла. Спачатку трэба ўбачыць на ўласныя вочы тыя ўмовы, у якіх працуюць на кандытарскіх прадпрыемствах за мяжой. Па саставу сённяшні шакалад «Камунаркі» коштам 204 рублі за 100 грам не адрозніваецца ад таго, што прапаноўваўся нам раней за 1 рубель 20 капеек. Чым ён адрозніваецца ад імпартнага шакаладу, на фабрыцы не ведаюць — гэта ж камерцыйная тайна. Між тым «Камунарка» атрымлівае какаву з Германіі, туды ж накіроўваецца і значная частка яе шакаладных вырабаў. Хутка скончыцца будаўніцтва новага склада гатовай прадукцыі на тэрыторыі фабрыкі. Плануецца, што ён таксама будзе служыць перш за ўсё супрацоўніцтву з замежнымі партнёрамі. Вам прыкра? Але ж такі наш час, і «Камунарка» — толькі адзінкавая праява яго жорсткай рэчаіснасці.

Але калі вы ў чарговы раз з настальгічнай асалодай будзеце ўспамінаць былое багацце асартыменту «Камунаркі», прыгадайце, што і раней тут цяжка працавалася, былі праблемы з сыравінай, а яшчэ — з планам. З усіх бакоў ад кандытараў патрабавалі: «Больш, больш, больш!» (раней фабрыка выпускала звыш 100 назваў прадукцыі, сёння ж — не больш 10, па маіх асабістых падліках). Шыкоўныя цукеркі нашага дзесяцігадовага мінулага падаліся б вам горкімі, калі б вы ведалі іх сапраўдны кошт: Людзі, якія выраблялі іх, атрымлівалі мізэрныя заробкі і эканомілі грошы, зноў жа, на ўласным здароўі. У абедзенны перапынак работніцы фабрыкі елі хлеб з дармавым смятанкавым маслам і запівалі яго какавай, за якую таксама не трэба было плаціць. Парушаны абмен рэчываў ад такіх абедаў, зразумела, не аднаўляўся.

Вельмі песімістычная атрымалася карціна. Відаць, дзеці паглядзелі б на яе іншымі вачыма і не перасталі б верыць у кандытарскую вытворчасць як у сапраўдную казку. Ёсць надзея, што пакуль яны вырастуць, «Залаты ключык» стане менш залатым і назаўсёды захавае для дарослых дзяцей салдокі смак.

**В. БЯГУН.**

БЫЛЫЯ ЗНАЁМЫЯ

# ЁЙ ЗНОЎ НЕ ХОЧАЦЦА Ў ШВЕЙЦАРЫЮ

Яна спакойна ставіцца да розных з'яў нашага жыцця, якія, на нашу думку, павінны выглядаць для іншаземца жудаснымі. Яе больш хвалюе агульная камерцыялізацыя нашай рэчаіснасці, якая не шкадуе добрыя адносіны людзей.

Эвелін Штайнгер (магчыма, вы памятаеце гэта імя — у красавіку 1990 года мы пісалі пра яе) нарадзілася і жыве ў Швейцарыі. Той самай краіне, якая здаецца нам увасабленнем шчаслівага і багатага жыцця. Эвелін не адмаўляе сваёй радзіме ў высокім узроўні матэрыяльнай забяспечанасці. Але ў нас адчувае сябе лепш. Любіць успамінаць швейцарскую прымаўку: дзе пачынаюцца грошы, там заканчваецца дружба. Гаворыць, што ў яе краіне грошы заўсёды на першым месцы, і там больш складана знайсці сапраўдных сяброў, чым тут.

Яна не памятае, колькі разоў была ў Мінску, бо вельмі многа. Збіраецца сустракаць тут Новы год разам са сваімі бацькамі, якія ўпершыню прыедуць на Беларусь. Што яна распавядала ім пра нашу рэспубліку? А нічога. Яны не маглі ўявіць сабе, што сапраўды існуе такая экзотыка. Цяпер будуць мець магчымасць пераканацца на ўласныя вочы...

Эвелін працуе ў Міжнароднай грамадзянскай службе — арганізацыі, якая наладжвае абмен працоўнымі атрадамі паміж рознымі краінамі. Да нас Эвелін упершыню трапіла менавіта ў складзе такога атрада. А зараз сама займаецца студэнцкім працоўным абменам — таму зноў у Мінску, сярод супрацоўнікаў Міжнароднай арганізацыі занятасці моладзі і студэнтаў. Ёй вельмі падабаецца такая дзейнасць. Яна ўпэўнена, што ў гэтых атрадаў вялікая будучыня, і хоча прыняць удзел у яе набліжэнні. Менавіта тут, на Беларусі, бо ў нас усё толькі пачынаецца, і работы — непачаты край.

Эвелін Штайнгер, здаецца, завітала да нас, каб знішчыць апошнія нашы ілюзіі наконт далёкага замежжа, а яшчэ больш — наконт нас саміх. Нават калі б яна не размаўляла так цудоўна па-руску і не гаварыла хвалебныя словы ў наш адрас, яна ўсё роўна дапамагла б нам зразумець вельмі простыя і важныя рэчы. Далёкія краіны — прыгожая мара. Толькі мара, якая ў жыцці выглядае зусім інакш. Набліжэнне да яе не можа пазбавіць нас ад праблем, бо самыя значныя з іх — у нас саміх. А самому сабе не скажаш «бывай» нават у самых аддаленых кропках свету...

**В. БЯГУН.**

ДАЙДЖЭСТ

# НЕ ВЕР ВУШАМ СВАІМ

Часцяком агульнапрынятыя ісціны аказваюцца проста лухтой. Сотні прыказак і прымавак, што ўспрымаюцца як народная мудрасць, не адпавядаюць рэчаіснасці.

Напрыклад, гавораць, што на працягу адной гадзіны пасля ўжывання ежы нельга плаваць. Але многія спартсмены сцвярджаюць, што на трэніроўках пастаянна плаваюць на доўгія дыстанцыі адразу ж пасля прыняцця ежы. Аб тым жа сведчаць і выкладчыкі фізкультуры, на вачах якіх сотні людзей плаваюць непасрэдна пасля трапезы і пры гэтым не пакутуюць ад спазмаў страўніка.

Многія ўпэўнены, што чым карацей стрыгчы валасы, тым хутчэй яны вырастаюць. На самой справе валасы проста становяцца больш жорсткімі, калі пачынаюць адрастаць, а на тэмпы іх росту гэта ніяк не ўплывае.

Існуе павер'е, што сёмы год сямейнага жыцця з'яўляецца крызісным. Але калі звярнуцца да статыстыкі разводаў, можна пераканацца, што такая з'ява ў жыцці адсутнічае. Каля двух працэнтаў пар разводзяцца ў першы год пасля вяселля, чатыры працэнты — у другі, і прыкладна пяць працэнтаў — у кожны з наступных трох гадоў. Потым колькасць разводаў рэзка змяншаецца.

Бацькі заўсёды забараняюць дзецям чытаць у цемры, каб тыя не сапсавалі вочы. Але яны памыляюцца. Па меркаванню Амерыканскай Акадэміі Афтальмалогіі, «чытанне пры слабым асвятленні псуе зрок не больш, чым фатаграфаванне пры такім жа асвятленні псуе фотаапарат».

Лічыцца, што жанчыны здольныя суперажываць лепш, чым мужчыны. Тыпічнымі жаночымі якасцямі называюць уменне выхоўваць і спачуваць, чуллівасць і так званую жаночую інтуіцыю. А ці сапраўды гэтыя якасці развіты лепш, чым у мужчын?

Даследванні паказваюць, што адназначнага адказу на гэтае пытанне няма. Хлопчыкі, калі іх просяць уявіць сабе, што адчувае іншы чалавек, робяць гэта не горш чым дзяўчынкі. Тэст на інтуіцыю, у якім прымалі ўдзел 200 дарослых, таксама не выявіў ніякіх адрозненняў, якія залежаць ад полу. Затое доказана, што жанчынам лепш удаецца выбраць позу, выражэнне твару і тон голасу.

Пры поўні, як здаецца многім, яны бываюць асабліва ўзрушанымі, некаторыя нават губляюць розум. Было зроблена мноства спроб пакласці віну за забойствы і самазабойствы на святло поўні. Аднак большасць навуковых даследванняў, асабліва апошніх, не знаходзіць тут ніякай сувязі.

Некаторыя вучоныя звярнуліся да статыстыкі няшчасных выпадкаў у бальніцах «хуткай дапамогі», забойстваў, катастроф на чыгунцы і нават колькасці пенальці ў хакейных матчах. Вынік — нулявы. Даследчыкам удалося толькі ўстанавіць сувязь паміж ВЕРАЙ ва ўздзеянне поўні і верай у іншыя містычныя рэчы.

САКРЭТ ФІРМЫ

# БДЭУ НА МІЖНАРОДНЫМ УЗРОЎНІ

Апошнім часам жыццё Беларускага эканамічнага універсітэта праходзіць пад знакам разнастайных кантактаў з замежжам.

Студэнты факультэта міжнародных эканамічных зносін прымалі гасцей з эканамічнага факультэта універсітэта Франкфурта-на-Майне на сумесным рабочым семінары «Рэфарміраванне сучасных эканамічных сістэм і развіццё прадпрымальніцтва». Другакурснікі праслухалі лекцыю кіраўніка нямецкайдэлегацыі прафесара, доктара эканамічных навук Ульрыха Петэра Рыттэра «Параінальны аналіз функцыяніравання цэнтральных банкаў краін Заходняй Еўропы». А студэнты трэцяга курса прынялі ўдзел у дзелавой гульні «Рэгуляванне гаспадарчых працэсаў на мікраўзроўні (вопыт ФРГ)».

Наведаў БДЭУ і госць з Галандыі — прафесар Амстэрдамскага універсітэта Дэ Фрыз. Ён прачытаў лекцыі па праблемах эканомікі, рынку, бізнесу і фінансаў сваёй краіны.

А студэнтам-трэцякурснікам пашанцавала на сустрэчу з прафесарам Пертскага універсітэта Джонам Кельмарам, які пазнаёміў іх з аўстралійскай сістэмай эканомікі малога бізнесу і маркетынга.

◆◆◆

## БЫВАЙ, АНГЛІЙСКАЯ!

Непадалёку ад Санкт-Пецярбурга адкрыўся кангрэс расійскіх эсперантыстаў. Былі абмеркаваны арганізацыйныя і фінансавыя пытанні. Пад час кангрэса спецыяльная камісія правяла атэстацыю прэтэндэнтаў на права выкладання мовы.

Так што — бывай, англійская!

## ФОНД САРОСА Ў РАСІІ

У студзені чакаецца прыезд у Маскву заснавальніка Фонду Джорджа Сароса.

Цяпер жа вырашаецца пытанне аб размяшчэнні прадстаўніцтва Фонду ў Маскве. Будзе набрана шмат супрацоўнікаў, установлена абсталяванне і зацверджана форма анкеты-заяўкі ад жадаючых.

**Калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта выказвае глыбокае спачуванне рэктару універсітэта Фёдару Мікалаевічу КАПУЦКАМУ з выпадку напаткаўшага яго гора — заўчаснай смерці жонкі.**

